# КІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ КРЫЧАЎСКАГА РАЁННАГА КРАЯЗНАЎЧАГА МУЗЕЯ

**Л. У. Ляховіч,** *канд. гістарычных навук,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі*
*і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Крычаўскі раённы краязнаўчы музей заснаваны ў 1959 г. і адкрыты для наведвання ў 1961 г. на аснове калекцый, сабраных гісторыкам М. Ф. Мельнікавым. Плошча экспазіцыі складала 318 кв. м., на 1997 г. у музеі налічвалася больш за 15,4 тыс. экспанатаў асноўнага фонду. Сярод экспанатаў – матэрыялы археалагічных раскопак, калекцыі манет часоў Вялікага Княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі, зброі XIV ст. У экспазіцыі прадстаўлены матэрыялы, якія датычацца Грунвальдскай бітвы, Паўночнай вайны 1700–1721 гг., Крычаўскага паўстання 1743–1744 г., гісторыі Крычаўскай суднаверфі, дзейнасці народнікаў, рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. і інш. Асобнае месца займала экспазіцыя (размяшчалася на плошчы 50 кв. м.), прысвечаная Вялікай Айчыннай вайне [3, с. 667]. На пачатак 2007 г. плошча экспазіцыі складала 298 кв. м і налічвалася 18 590 адзінак захавання асноўнага фонду [1].

У 2008 г. музей пераведзены ў палац Р. А. Пацёмкіна, будынак якога з 1988 г. знаходзіўся на рэстаўрацыі. Палац князя Р. А. Пацёмкіна быў пабудаваны ў 1776–1786 гг. вядомым рускім архітэктарам, заснавальнікам класіцызму І. Я. Старовым, які з'яўляецца таксама стваральнікам Таўрычаскага палаца ў Санкт-Пецярбургу. Будаўніцтва адбылося з нагоды падаравання Кацярынай II у 1776 г. Крычаўскага староства Р. А. Пацёмкіну. У хуткім часе, у 1787 г., палац разам з Крычавам быў падараваны Пацёмкіным мясцоваму памешчыку І. Галынскаму, нашчадкі якога потым валодалі Крычавам. У 1840-х гг., у адпаведнасці з новай модай, палац быў рэканструяваны, ён набыў рысы неаготыкі. У 1917 г. у былым палацы была адкрыта першая на Крычаўшчыне савецкая школа імя У. І. Леніна, потым тут размяшчалася педагагічнае вучылішча. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны будынак захаваўся, яго выкарыстоўвала ў сваіх мэтах акупацыйная адміністрацыя. Пасля вайны палац Пацёмкіна называлі «каменным палацам Галынскіх», у 1960-я гг. тут

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

размяшчаўся спальны корпус школы-інтэрната, а з 1988 г. будынак знаходзіўся на рэстаўрацыі [1].

Неабходна адзначыць, что з пераездам у новае памяшканне змянілася канцэптуальнае бачанне экспазіцыі музея, што не магло не праявіцца ў асаблівасцях культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. Так, было вырашана немэтазгодным аднаўляць экспазіцыю па ўсіх гістарычных перыядах як не адпавядаючую патрабаванням часу. Аднак пры гэтым неабходна было ўсё ж адлюстраваць гістарычнае мінулае краю.

У адпаведнасці з камунікатыўным кірункам у музейнай дзейнасці было прынята рашэнне «пагрузіць» наведвальніка ў атмасферу канца XVIII – сярэдзіны XIX ст. Было прынята рашэнне зрабіць акцэнт на стварэнні культурнага асяроддзя княжацкага палаца з уключэннем туды тэматычна прыдатных фрагментаў экспазіцыі. Напрыклад, у «Зімовым садзе» размясціць экспанаты, якія адлюстроўваюць будаўніцтва палаца, у «Рыцарскай зале» – узоры зброі, у «Кабінеце-бібліятэцы» – археалагічныя экспанаты і чучалы птушак, узятыя з экспазіцыі, прысвечанай прыродзе краю; экспазіцыйныя комплексы дапоўніць нумізматычнымі, археалагічнымі, кніжнымі калекцыямі.

Гістарычная рэканструкцыя з'яўляецца першачарговай у рабоце музейных супрацоўнікаў і ажыццяўляецца ў залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі. Неабходна адзначыць непаўнату і малакалькаснасць калекцый, якія паслужылі б асновай рэканструкцыі. Таму часткова для рэканструкцыі прымяняюцца арыгінальныя экспанаты, а часткова – адноўленыя прадметы. Праблемай музея з'явіліся недахоп ці адсутнасць сродкаў, якія б накіроўваліся як на закупку антыкварыяту, так і на набыццё адноўленых прадметаў ці копій арыгінальных твораў мастацтва. Напрыклад, кошт мэблі і прадметаў ужытку XIX ст. склаў: буфет – 6 000 000 руб., сервіз чайны – 7 000 000 руб., паднос – 1 000 000 руб. [4]. Копія партрэта Кацярыны II з арыгінала Лявіцкага – 12 000 000 руб., партрэта Р. А. Пацёмкіна з арыгінала Лампі – 5 000 000 руб., графічная выява герба Галынскіх – 1 000 000 руб. [5]. Яшчэ больш дарагімі з'яўляюцца копіі рыцарскіх даспехаў і ўзбраення.

Асноўная экспазіцыя будзе размешчана ў 15 залах агульнай плошчай 439,06 кв. м. Прапануюцца наступныя тэматычныя кірункі гістарычнай экспазіцыі (1–10):

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. «Гісторыя палаца» – інтэр’ерная зала ў стылі «зімовага палаца» другой паловы XIX ст. з тэматычнай экспазіцыяй, прысвечанай гісторыі палаца.

2. «Дзявочая» – інтэр’ерная зала.

3. «Кухня» – інтэр’ерная зала.

4. «Сталовая» – інтэр’ерная зала.

5. «Кабінет-бібліятэка: збор рарытэтаў» – тэматычная экспазіцыя, прысвечаная гісторыі крычаўскага краю з 1772 г. да пачатку XX ст., з элементамі інтэр’ера XVIII–XIX стст.

6. «Рыцарская зала» – тэматычная экспазіцыя, прысвечаная гісторыі Крычава і крычаўскага краю ад старажытнасці да 1760-х гг., з элементамі інтэр’ера XVII – першай паловы XVIII ст.

7. «Будуар» – інтэр’ерная зала.

8. «Парадная зала» – з асобнымі элементамі інтэр’ера, які аднаўляе атмасферу эпохі Кацярыны II; плануецца выкарыстоўваць як канцэртна-лекцыйную залу.

9. «Канапная» – інтэр’ерная зала.

10. «Прыказчыцкая» – інтэр’ерная зала.

Экспазіцыя «Крычаўскі край на перакрыжаваннях XX ст.» уключае наступныя кірункі (11–15):

11. «Крычаўская воласць і г. Крычаў напярэдадні рэвалюцыйных падзей 1917 г.»; «Удзел жыхароў краю ў расійскіх рэвалюцыях»; «Усталяванне савецкай улады ў краі».

12. «Эканамічнае і сацыяльна-культурнае развіццё Крычаўскага раёна ў 1920 – 1940-я гг.»

13. «Абарона г. Крычава ў 1941 г.»

14. «Подпольны і партызанскі рух на тэрыторыі раёна ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі»; «Вызваленне краю ў верасні 1943 г.»; «Першыя крокі аднаўлення».

15. «Імі ганарыцца Крычаўшчына» (партрэтная галерэя) [2].

Памяшканне музея прыстасавана для ажыццяўлення разнастайных сацыякультурных функцый. Так, у 2008 г. у будынку палаца быў адкрыты Музей Маці. Экспазіцыя музея прысвечана жанчынам-маці Крычаўшчыны, якія праславіліся падчас Вялікай Айчыннай вайны, дзеці якіх сталі героямі Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенных лакальных канфліктаў, шматдзетныя маці, маці знакамітых людзей, гераіні працы і інш.

У будынку палаца знаходзіцца таксама аддзел ЗАГС. Гэты факт абумоўлены гістарычна. Калі ў сярэдзіне XIX ст. у Крычаве згарэў драўляны касцёл, абрады было дазволена праводзіць у палацы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Палац Пацёмкіна з'яўляецца цэнтрам культурнага жыцця Крычава. Патрэбна адзначыць акцэнтаванне культурна-асветніцкай дзейнасці музея менавіта ў самім палацы. Тут функцыянуюць некалькі выставачных залаў, дзе дэманструюцца працы мясцовых і іншагародніх аўтараў. На базе палаца праводзяцца прэзентацыі новых работ мастакоў, пісьменнікаў, тэатралізаваныя відовішчы і інш. Вясной 2011 г. у палацы адбылася прэм'ера музычнага салона, які з тых часоў рэгулярна праходзіць раз у месяц. Тэматыка музычных вечарын разнастайная – «Вечар класічнай музыкі», «Вечар раманса», «Вечар вальса»; падчас вечарын выступаюць народны ансамбль «Спадчына», камерны ансамбль «Віёла» і інш.

У будынку палаца працуе салон-магазін, дзе наведвальнікі могуць набыць вырабы дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, творы жывапісу, выкананыя мясцовымі майстрамі.

Найбольш распаўсюджанымі формамі культурна-адукацыйнай дзейнасці музея з'яўляюцца арганізацыі выстаў, тэматычных вечарын, а таксама музейныя заняткі. Напрыклад, восенню 2011 г. былі праведзены наступныя мерапрыемствы: у верасні – выстава «За мужнасць і стойкасць», выстава мастака С. Н. Масіха «Мой шлях»; музычны салон з выступленнямі народнага ансамбля «Спадчына» і камернага ансамбля «Віёла», шэсць музейных заняткаў. У кастрычніку прайшло святкаванне 875-годдзя Крычава і 68-годдзя вызвалення яго ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў; арганізаваны выстава «Нам 875 гадоў» і этнаграфічная выстава «Унутранае аздабленне дома». Таксама былі арганізаваны выстава «Нашых маці рукі залатыя», вечар-сустрэча «І музей адчыніў свае дзверы…» (да 50-годдзя адкрыцця першай экспазіцыі Крычаўскага краязнаўчага музея), адбыўся ўрачысты прыём жанчын-маці раёна, прысвечаны Дню Маці.

Трэба адзначыць, што Крычаўскі краязнаўчы музей перажывае дастаткова складаны перыяд станаўлення на новай аснове. Гэта датычыцца і новай канцэпцыі экспазіцыі, і неабходнасці рэканструкцыі і запаўнення залаў для стварэння належнага гісторыка-культурнага асяроддзя. Адной з праблем музея з'яўляецца недахоп сродкаў для названай мэты. Акрамя таго, музей не мае ніводнага спецыяліста-музеязнаўцы, няма прытоку маладых кадраў у музей. Між тым прафарыентацыйная работа і ўвага да дзіцячай і падлеткавай аўдыторыі маглі б быць вельмі запатрабаванымі і перспектыўнымі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Дворец* князя Потемкина: история и современность // Материалы текущего архива Кричевского районного краеведческого музея.

2. *Обоснование* необходимости создания новой экспозиции Кричевского районного краеведческого музея // Материалы текущего архива Кричевского районного краеведческого музея.

3. *Памяць:* гіст.-дакум. хроніка Крычаўскага раёна. – Маладзечна: Перамога, 2004. – 711 с.

4. *Список* экспонатов для экспозиции Кричевского районного краеведческого музея во дворце Потемкина (вторая очередь) // Материалы текущего архива Кричевского районного краеведческого музея.

5. *Список* творческих работ для дворца Потемкина в Кричеве (Кричевский районный краеведческий музей, вторая очередь) // Материалы текущего архива Кричевского районного краеведческого музея.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ